***«Тенденциираз витияли тературы с 1917 по 1930-е** гг. **XXв.»***

*Условно обзорную тему можно разделить на блоки:*

*1. Общая характеристика развития русской литературы 1917- 1920 гг.*

*2. Русское литературное зарубежье.*

*3. Русская литература 1920-1930 гг. (с анализом одного-двух произведений).*

*4. Обсуждение самостоятельно прочитанных произведений.*

*Перед чтением лещии учащимся предлагается план, по которому они составляют конспект лекции, выписывают лексику, характеризующую эпоху.*

*В процессе чтения лекции возможно обращение ггмузыкальным и живописным произведениям, отражающим тенденции в развитии искусства данного периода.*

*План лекции «Тенденции развития литературы 1917- 1930-х годов»*

*I. Общая характеристика развития русской литературы 1917- 1920-х гг.:*

*1. Октябрьская социалистическая революция и судьбы литературы.*

*2. Трагедия русской литературы.*

*3. Зарождение социалистической литературы. Пролеткульт и его разрушительное воздействие на литературный процесс.*

*4. Эмиграция. «Внутренняя» эмиграция как способ сохранения независимости литературной позиции.*

*Специфика этого занятия заключается в том, что учитель должен подчеркнуть: русская литература после 1917 года разделилась на несколько течений. Поэтому с самого начала советского периода перед литераторами был поставлен вопрос: с кем вы, мастера культуры? Не примкнуть к какому-либо лагерю было почти невозможно. Тем более что явственно подразумеваюсь: кто не с нами, тот против нас. Практически никто не сумел остаться аполитичным.*

*Следует сделать акцент на то. что с 1917 года в литературе началась отчаянная борьба: с одной стороны — литературное инакомыслие, повлекшее за собой литературную внешнюю и внут-1\'чн\->ю эмиграцию, с другой — литературное послушание (хотя ти голоса тоже не всегда сливались в согласный хори Живой лиігггкгрныіі процесс начал подвергаться сильнейшему идеологическому прессингу.*

*В ходе занятия целесообразно обратиться к уже изученным г.уо: сведениям: А. Блока «Интеллигенция и революция». И. Бунина*

*«Окаянные дни», М. Горького «Несвоевременныемысли».*

*Можно обсудить основные проблемы произведений, прокомментировать их, тем самым закрепляя изученный материал.*

*II. Русское литературное зарубежье:*

*1. Судьба русской литературы в эмиграции.*

*2. Основные темы и мотивы произведений авторов русской литературы эмиграции.*

*К занятию необходимо подготовить несколько небольших сообщений учащихся о судьбах писателей-эмигрантов (И. Шмелев, Б.Зайцев, З. Гиппиус, В. Набоков, М. Цветаева, А. Куприн, И. Бунин).*

*К занятию целесообразно привлечь стихотворения о России М. Цветаевой, З. Гиппиус, В. Ходасевича, Г. Иванова, И. Бунина; отрывки из произведений: И. Шмелева «Лето Господне», Б. Зайцева «Путешествие Глеба», И. Бунина «Жизнь Арсеньева».*

*III. Русская литература 1920-1930-х годов:*

*1. 20-е годы XX века.*

*Многоголосие, разнообразие авторских манер в литературе 20-х годов. Литературная борьба.*

*Появление разнообразных творческих группировок в 20-е годы (ЛЕФ, РАПП, «Перевал», «Серапионовы братья»).*

*20-е годы — расцвет русской драматургии, время великого театра («Дни Турбиных», «Зойкина квартира» М. Булгакова; «Мандат», «Самоубийца» Н. Эрдмана; «Блоха» С. Замятина; «Клоп» В.Маяковского).*

*20-е годы — время поиска и эксперимента в литературе. Главной темой в литературе было изображение революции и гражданской войны. Осмысление этого времени требовало различных форм. Одно простое перечисление являет это многообразие: социально-психологический роман М. Булгакова «Белая гвардия»; художественно-документальный роман Д. Фурманова «Чапаев»; фрагментарные части, которые сливались в грандиозную картину — «Голый год» Б. Пильняка; подлинные события, неповторимый колорит времени в «Железном потоке» А. Серафимовича и «Донскихрассказах» М. Шолохова; лирико-романтическая стихия властвовала в «Падении Дайра» А. Малышкина; острейшие социальные и нравственные ситуации переполнят «Конармию» И. Бабеля; символически изображались кровавые годы в •<России. кровью умытой» А. Веселого.*

*20-е годы углубляли процесс исследования сложных человеческих характеров. Разнообразнь: людские судьбы у В. Вересаева в «В тупике». Л. Леонова в «Барсук.тх» и «Воре». Ф. Гладкова в «Цементе». Сильны были х\-дожники. широко использовавшие гротеск, фантастику, иронию и сатиру: рассказы М. Зощенко, «Город Гра-*

*дов» А. Платонова, «Собачье сердце» М. Булгакова, «Мы» Е. Замятина. «Двенадцать стульев» и «Золотой теленок» И. Ильфа и Е.Петрова, «Алые паруса» и «Бегущая по волнам» А. Грина.*

*В 20-е годы началась работа и над романами, тяготевшими к эпопее: «Жизнь Кли.иа Самгина» М. Горького, «Мастер и Маргарита» М. Булгакова, «Хождение по мукам» А.Толстого, «Тихий Дон» М. Шолохова.*

*На протяжении всех 20-х годов русской литературе во многом удаваюсь противостоять общему шаблону, почти не поддаюсь государственному уравнению живая жизнь. Но с переломного 1929 года все изменилось. Именно этот год ознаменовал начало травли М. Булгакова, А. Платонова, Б. Пильняка. ИмеЪю с этого года было резко нарушено относительное равновесие сил. В литературу перенеслись методы беспощадной политической борьбы. Наступало новое время с новыми героями и новым пониманием вещей в произведениях. Это была общая драма русской интеллигенции, пережитая ею на рубеже 20-х и 30-х годов.*

*2. 30-е годы XX века.*

*В теории литературы утверждалась поэтика строгого жизнеподоюия, отрицался любой эксперимент, отметались лирико-романтические, фантастические и гротесковые жанры.*

*Из драматургии постепенно уходил живой противоречивый человек. Идеалом стал герой-борец, преодолевающий все препятствия на пути, не знающий сомнений («Оптимистическая трагедия» и «Последний решительный» Вс. Вишневского, «Человек с ружьем» Н.Погодина. «Правда» А. Корнейчука). Истинная драма создавалась «вопреки». То, что запрещалось, сегодня стало тем, без чего наша культура немыслима: «Дни Турбиных». «Бег». «Кабала святош» М.Булгакова, «Мандат» и «Самоубийца» Н. Эрдмана, «Тень», «Дракон». «Обыкновенное чудо» Е. Шварца.*

*Одна из самых значительных— комедия «Мандат» Н. Эрдмана. С одной стороны — это водевильное «разоблачение» мещанства. с другой — история всеобщего страха, который деформирует душу человека. «Что важнее— личность или «мандат», бумажка, ее удостоверяющая?» — вопрос не пьесы, а эпохи. Сатирическая комедия Эрдмана имела безусловный трагический подтекст.*

*Появтасъ первая «потаенная» отечественная литература (М. Булгаков, Л. Плшг.снов, О. Мандельыгклм и др.). Усиление жесткого контроля над литературным процессом.*

*Создание вместо разнообразных группировок единого Союза советских писателей. Начало широкой активной реанізаціш принципов социалистического реализма. Советуем сделать более подробный анализ метода социалистического реализма как основного*

*для советской литературы вплоть до 1990-х годов.*

*Соц(реализм формировал взгляд на советскую литературу как на что-то монолитное и единое, все «потаенное» и «зарубежное» отмелось сразу же. И поэтому не случайно сегодня звучит вопрос: эстетическими или сугубо политическими были границы этого метода? Действительно, альтернатива соцреализму отвергалась иногда на уровне репрессий. Но в литературе этого метода взаимосвязь личности и истории осмыслена на уровне эстетики, как новый тип взаимодействия, ведущий к формированию новой концепции личности. Спорить было не о чем — концетійя человека, «положительного героя» в революционном развитии была уже сформирована. Эта концепция предполагала обязательным героическое начало в человеке. Утверждалась личность, способная жертвовать всем во имя светлого будущего, которая видит смысл всей жизни в борьбе с теми, кто не разделяет этого идеала.*

*Естественно, что принадлежность к этому методу накладывала на художника целый ряд обязательной тематики: литература и общество неделимы; непременное изображение классовой борьбы, якобы раздирающей общество: художник должен «перековывать человеческий материей». Соответственно, критерии оценки произведений были достаточно жесткими.*

*Произведения социалистического реализма разнообразны по стилю и содержанию, но в каждом — в открытом или косвенном значении — есть эти главные цели метода. Поэтому у разных произведений заранее известна направленность сюжета и действия героев, а финалы — почти всегда — оптимистичны.*

*В значительной части — это воспитательные романы, направленные к созданию будущего идеала — нового человека, молодого энтузиаста, положительного героя в его революционном развитии («Как закалялась сталь». «Поднятая целина», «Хождение по мукам» и многие другие).*

*Социалистический реализм стаі отражением трагической ситуации умонастроений в стране: одно для себя, другое — для официальной обстановки и литературы. Этот метод стач наступлением на духовную жизнь художника: строгие рамки формы и содержания одних обрекчи на молчание, других — на художественное беепчодие. Сам по себе соцреализм не остановил литературного развития: в 30-е— 40-е годы были написаны «Мастер и Маргарита» М. Булгакова, «Тихий Дон» М. Шолохова. «Доктор Живаго» Б.Пастернака. «Петр Первый» А. Толстого. «Зачеркнуть и забыть» социалистический реализм исторически невозможно. Признать же. что этот метод был не единственным для советской литературы и стал далеко не вершиной мирового литературного*

*процесса, думается, необходимо.*

*Соцреализм стал прекрасным прикрытием для произведений, увенчанных различными премиями, а потому обязательных для чтения и изучения. Но как можно было требовать рамок и благостности от русской литературы, которая испокон веков отвечала за неприкаянную душу человека?!*

*«Основным героем книг» был объявлен труд. В 30-е годы началось интенсивное развитие «производственной прозы» (В. Катаев «Время, вперед!», Л. Леонов «Соть», М. Шагинян «Гидроцентраль», Ф. Гладков «Энергия» и др.). Рабочие речи зазвучали со страниц прозы и поэзии, герои-труженики проникли на подмостки сцены. Трудовая деятельность стала предпочтительнее духовной жизни. Выделим одного из типичных героев «производственной прозы» - механика Басова из книги Ю. Крымова «Танкер "Дербент"». Политическая зрелость, неудовлетворенность достигнутым, высокое сознание своей ответственности перед обществом — эти черты на долгие годы станут литературными штампами. Хотя, по мысли авторов, Басов и ему подобные герои олицетворяют собой новую ступень в развитии социалистического личности.*

*Бурно развивались исторические жанры. Интерес к переломным моментам отечественной истории проявили А. Толстой в «Петре Первом», А. Новиков-Прибой в «Цусіше», С. Сергеев-Ценский в «Севастопольской страде» и др. Некоторые авторы обратились к историко-биографическому жанру («Радищев» О.Форш, «Пушкин» Ю. Тынянова, «Спартак», «Батый» Ю. Тынянова). Новое общество нуждалось в переосмыслении своей истории, и в произведениях активно шел процесс переоі)енкй прошлого России. Исторические анаюгии были призваны укреплять в правильности избраного социалистического пути. История не разрываіась с современностью.*

*Менее других пострадала доку.ментально-художествецная литература. Назовем произведения К. Паустовского «Мещерская сторона». В. Бианки «Лесная газета», Б. Житкова «Телеграмма», М. Пришвина «Жень-шень», В. Арсеньева «Дерсу У зала».*

*Ради «литературной справедливости» следует заметить, что социашстический реализм был не единственным направлением в русской литературе. Но альтернативные варианты открыто не декларировались. не констатировались -<оштікой и читателями. Выделим натурализм А. Веселого (точное и бесстрастное физиологическое изображение реаіьностй и человеческого характера): романтизм Б. Пастернака: экспрессионизм А. Платонова и Е. Замятина (апокалиптическоеусловное преувеличение важной для автора мыс.'ш: импрессионизм А. Белого. Б. Пильняка. О. Мандельштама.*

*М. Булгакова (отсутствие четко заданной формы, многоликое, мимолетное чувство и впечатление).*

*Все эти системы, в отличие от социалистического реализма, не имели такой творческой программы, практически каждое произведение названных авторов стояло особняком в литературном процессе. Несмотря на то что соцреализм предопределил даже вопросы стиля и формы, до конг/а он не смог вытеснить эстетические альтернативы. В недрах литературы йіла плодотворная работа, творения многих авторов вышли на поверхность лишь спустя полвека.*

*30-е годы — трагическое время для русской литературы. Но все авторы — сыны своего времени. Это судьбы «вывихнутого» времени писателей «с перепуганной душой» (М. Зощенко). Пренебрежение этим моментом может существенно исказить картину литературной жизни 1920-1930-х годов.*

*Целесообразно завершить тему «Тенденции развития литературы с 1917 по 1930-е годы» уроком анализа небольшого произведения изученного периода. Одиннадцатиклассники анализируют дома письменно одно из предложенных произведений. Учитель может по своему выбору изменить произведения для анализа.*

*Для анализа предлагаются произведения (по вариангшм):*

*1. А. Аверченко. Дюжина ножей в спину революции (один га рассказов цикла по выбору учащегося). И. Бунин. «Митина любовь».*

*2. М. Булгаков «Красная корона» (рассказ). И. Бабель «Одесские рассказы» (по выбору учащегося).*

*Темы для письменного анализа:*

*1. Поэтизация и романтизация стихии революции (по рассказу Б. Лавренева «Сорок первый»),*

*2. Личность и коллектив (по произведению Е. Замятина «Мы»).*

*3. Восприятие революции публицистами разных направлений (М. Горький «Несвоевременные мысли»: А. Аверченко «Дюжина ножей в спину революции»; А. Блок «Интеллигенция и революция»; И. Бунин «Окаянные дни»),*

*4. Ста крови или ста идеи? (по «Донским рассказам» М.Шолохова).*

*5. Интеллигенция и революция (судьбы героев рассказа М.Булгакова «Красная корона ->,*

Рашэтнікава Н. Б., Дылеўская В. Ю.

# ТЭОРЫЯ ЛІТАРАТУРЫ Ў СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЕ

## План лекцыі

1. Тэорыя літаратуры і яе значэнне ў школьнай літаратурнай адукацыі.
2. Фарміраванне тэарэтыка-літаратурных паняццяў у сярэдніх класах.
3. Фарміраванне тэарэтыка-літаратурных паняццяў у старэйшых класах.

## 1. Тэорыя літаратуры і яе значэнне ў школьнай літаратурнай адукацыі

Вывучэнне **тэорыі літаратуры** ў сярэдняй школе складае падмурак эстэтычнай адукацыі і эстэтычнага выхавання школьнікаў. Як адзначала **Г.** Звягінцава, "тэорыя літаратуры ў школе- **мова** мастацкага **слова,** пачатковая грамата, з якой пачынаецца разумение вучнямі жыцця, адлюстраванага ў творы. Веды па тэорыі літаратуры- компас для арыентацыі вучняў у свеце мастацтва і акаляючай рэчаіснасці... Тэарэтычныя веды, якія ўключаюцца ў чытацкую дзейнасць вучня, у вызначанай ступені аберагаюць як **ад** бязгусціцы і пошласці і арыентуюць яго думку і пачуццё".

Тэорыя літаратуры ўплывае на выхаванне эмацыйна-эстэтычных адносін да мастацтва. У метадычных адносінах заданы вывучэння тэарэтыка-літаратурных паняццяў заключаюцца ў тым, каб далучыць школьнікаў да ідэйна-маральнага і эстэтычнага быцця мастацкага твора, развіць здольнасці эмацыянальна-эстэтычнага ўспрымання мастацтва слова.

Роля *эстэтычных эмоцый у* фарміраванні асобы падкрэслівалася яшчэ В. Бялінскім. Крытык сцвярджаў. што "без эстэтычнага пачуцця пошдыя і розум, і сумленнасць, і адукаванасць".

Як вядома. навукл пра мастацкую літаратуру (літаратуразнаўства) уключае ў слое гісторыю літаратуры, тэорыю літаратуры і літаратурную крытыку. Кожны з гэтых раздзелаў прадстаўлены ў школьным курсе беларускай лігаратурьг. Асабліва грунтоўна вывучаецца ў школе тэорыя літаратуры. якая разглядае мастацкую літаратуру як форму грамадскай свядомасці. спецыфіку

канкрэтнага мастацкага твора, тэматыку, ідэйную накіраванасць, мастацкія вобразы, сюжэт і кампазіцыю, роды і жанры, працэс развіцця літаратуры ў розныя гістарычныя эпохі.

Сістэма тэарэтыка-літаратурных паняццяў, што фарміруюцца ў вучняў, адлюстроўвае сістэму самой навукі.

## 2. Фарміраванне тэарэтыка-літаратурных паняццяў у сярэдніх класах

У сувязі з тым, што праграма па літаратуры для сярэдніх класаў прадугледжвае вывучэнне асобных мастацкіх твораў, падбор тэарэтыка-літаратурных паняццяў звязаны перш за ўсё з характарыстыкай мастацкага твора як адзінага цэлага.

У старэйшых класах да іх дадаюцца паняцці па ўсіх асноўных кірунках тэорыі літаратуры, таму што кожны мастацкі твор разглядаецца ў курсе беларускай лтаратуры як этап літаратурнага працэсу, вывучаецца ў сувязі з характарыстыкай эпохі і творчай індывідуальнасцю пісьменніка.

Складанасць засваення вучнямі тэарэтыка-літаратурных паняццяў заключаецца ў тым, што, па-першае, адсутнічае матывацыя ў навучанні, таму што школьнікі не ўсведамляюць неабходнасць іх вывучэння як у курсе беларускай літаратуры, так і ў курсе рускай, не разумеюць, што асновы навукі пра літаратуру павінны стаць інструментам глыбокага, аб'ектыўна дасканалага разумения мастацкага твора, творчасці пісьменніка, своеасаблівасці літаратурнага працэсу. Па-другое, вучні, як правіла, не мэюць дастатковай літаратурнай і лінгвістычнай падрыхтоўкі для засваення паняцця.

Самая вялікая складанасць заключаецца ў тым, што ўсе тэарэтыка-літаратурныя веды і ўменні, якімі валодае школьнік, павінны выступаць не ізалявана (самі па сабе), а ва ўзаемасувязі: у працэс аналізу мастацкага твора адначасова ўключаюцца веды пра мастацкі твор, пра пісьменніка як аўтара твора, пра мастацкую літаратур^ як від мастацтва, а таксама ўменне зразумець, растлумачыць, асэнсаваць змест і форму твора.

Шляхі пераадолення цяжкасцей мы бачым у актуалізацыі і актызізацыі зедаў і ўменняў вучняў, ва ўмелым спалучэнні анатізу мастацкага твора з паслядоўнай работай па фарміраванні ў школьнікаў тэарэтыка-літаратурных паняццяў. На жаль, у школьнай практыцы работа пачынаецца і завяршаецца толькі знаёмства.м з тым ці іншым літаратурным тэрмінам, вучням прапануецца зав\"чыць вызначанае паняцце і ў лепшым выпадку растлумачыць яго ролю ў

тэксце вывучаемага твора. Такія веды не пераходзяць ва ўменні, маюць фармальны характар. Настаўнік і вучні адчуваюць бессэнсоўнасйь мёртвых ведаў, тэорыя літаратуры не становіцца інструментам дзейнасці, а мысленне пазбаўлена эмацыйнасці.

Адсюль узнікае неабходнасць у **сістэмна-функцыянальным** падыходзе да школьнага вывучэння тэорыі літаратуры як умовы сапраўднага засваення вучнямі тэарэтыка-літаратурных ведаў. Паслядоўнасць фарміравання тэарэтыка-літаратурных паняццяў вызначана методыкай выкладання літаратуры: ад першапачатковых назіранняў да разумения асноўных асаблівасцей і фармулёўкі паняцця і ад узбагачэння паняцця да свядомага *выкарысцмя* яго ў аналізе мастацкага твора і ўласна літаратурнай творчасці вучняў.

Разгледзім працэс фарміравання тэарэтыка-літаратурных паняццяў на канкрэтных прыкладах.

У праграме па беларускай літаруры для сярэдніх класаў (5-9) значнае месца адводзіцца вывучэнню мастацкіх сродкаў моўнай выразнасці. У 5 класе, напрыклад, даецца першапачатковае паняцце пра эпітэт, параўнанне, метафару, увасабленне.

Слова - асноўны элемент структуры літаратурнага твора. А ў разуменні спецыфікі вобразнага слова вучні паступова ідуць да засваення такіх паняццяў, як характар. пейзаж, мастацкая дэталь. Толькі пры ўмове, што вучні глыбока ўсвядомяць сувязь вобразнага слова з іншымі элементамі твора, можна выхаваць у школьнікаў здольнасць успрымаць твор у адзінстве зместу і формы.

Звернемся да праграмы 5 класа. Як было адзначана вышэй, менавіта пяцікласнікі атрымліваюць першапачатковае паняцце пра эпітэт, метафару і іншыя мастацкія сродкі моўнай выразнасці. Як паказвае педагагічны вопыт, вучні легка засвойваюць гэтыя паняцці, амаль беспамылкова знаходзяць у тэксце гэтыя паэтычны сродкі, але слаба ўсведамляюць іх ідэйна-мастацкае значэнне у вобразным змесце твора. Калі настаўнік не пашырае і не паглыбляе паняцце ў кожным канкрэтным выпадку, то школьнікі не змогуць растлумачыць мастацкую функцыю таго ці іншага сродка моўнай выразнасці. Дастаткова прапанаваць вучням невялікія вершаваныя і празаічныя ўрыўкі з твораў беларускіх пісьменнікаў і параіць упісдць у тэкст прапушчаныя эпітэт або метафару, параўнанне або ўвасабленне ^падобныя зрэзы не аднойчы праводзіліся метадыстамі), као псракандцца ў тым, што ў большасці выпадкаў будуць адсутнічаць тлумачэнні вучняў. Яны не ўмеюць разважаць над мастацкім тэкстам і тым оольш над словам у тэксце. хоць тэарэтычна паняцці засвоены імі добра.

Як жа павінна выглядаць сістэма работы па флрміраванні тэарэтыка-літаратурнага паняцця ў сярэдніх класах?

Звернемся да вучэбна-метадычных комплексаў па беларускай літаратуры. У праграме і падручніках-хрэстаматыях кожная тэарэтыка-літаратурная тэма замацавана за пэўным раздзелам або пэўным творам ці творамі. Безумоўна, для таго как сфарміраваць тэарэтыка-літаратурнае паняцце, настаўнік выкарыстае ўвесь мастацкі матэрыял, з якім вучні сустрэнуцца на уроках літаратуры.

Першапачатковае паняцце пра параўнанне (праграма, створаная аўтарскім калектывам Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта) вучні атрымоўваюць у 5 класе, калі вывучаюць апавяданне У. Караткевіча "Кніганошы". Пры азнаямленні вучняў з паняццем "параўнанне" абапіраемся на ўжо вядомае ім. У пачатковых класах школьнікамі ўжо тлумачыліся **паняцці прамога і пераноснага значэння слова.** Яны ведаюць, што слова, ужытае ў пераносным сэнсе, стварае яркі малюнак, выказвае аўтарскія думкі і пачуцці, якія і ўспрымае чытач. Пры вывучэнні такіх паняццяў, як "параўнанне" і "эпітэт", гэта агульнае палажэнне яшчэ **больш** канкрэтызуецца і замацоўваецца ў свядомасці школьнікаў.

Вызначаючы параўнанне як супастаўленне прадметаў або з'яў на аснове іх падабенства, укажам на тое, што параўнанні выкарыстоўваюцца не толькі для таго, каб намаляваць яркую карціну, наглядна паказаць нам тую ці іншую з'яву, стварыць у нас той ці іншы настрой, але і для, таго каб адкрываць нешта новае, падаць прадмет ці з'яву з такога боку, з якога раней яго не ведалі, не бачылі, не адчувалі.

Пейзажная замалёўка, з якой пачынаецца апавяданне "Кніганошы" У. Караткевіча, мае на мэце падрыхтаваць чытача да ўспрымання драматычных падзей. Менавіта таму аўтар шырока выкарыстоўвае своеасаблівыя эпітэты, метафары, параўнанні: *"Усё тут расло цяжка, змагаючыся за кожны глыток паветра, за кожны прачень, і таму мухаморы былі крывавыя, а з абсыпаных іглійай рыжыкаў, калі збіць іх пачкай, таксама тачылася рудая кроў... І качі тамтэйшы мужык бачыў купіну. унізаную карачячі журавін, ён таксама параўноўваў ягады з кроплямі крыві..."*.

Як бачым, мухаморы ў творы "крывавыя", з рыжыкаў "тачылася рудая кроў". а журавіны параўноўваюцца з "кроплямі крыві". Эпітэты, параўнанні, метафары (як кожны сродак моўнай мастацкай выразнасцП заўсёды нясуць ў сабе пэўную думку, пэўную эмацыйную афарбоўху. выра;каюць пзўнае пачуцце. У дадзеным выпадку - трывогу, прадчуванне трагічных падзей.

Важна растлумачыць зучням. што ў параўнанні можа пераважаць зрокавая зыяўленасць, малюнкавы пачатак або эмацыйны, напрыклад: *"А пра хаду і казаць не трэба. Дзіва. а не хада! Леоедзь ты.-г. а не діяўчына ідзеГ* Яркае, вобразнае

параўнанне дапамагае зразумець характар гераіні. Як бачым, Гануся - чалавек з гонарам і годнасцю. Параўнанне з'яўляецца сродкам выражэння пачуццяў аўтара, які любуецца сваёй гераіняй, захапляецца яе чалавечай існасцю.

Засваенне школьнікамі паняцця "параўнанне" працягваецца і на іншых уроках літаратуры. Мы звяртаем увагу школьнікаў на шматграннасць ролі параўнання ў тэксце. Такая ж роля эпітэта, метафары і іншых сродкаў моўнай мастацкай выразнасці.

З эпітэтам школьнікі знаёмяцца таксама ў 5 класе. Праграма, якая падрыхтавана супрацоўнікамі Нацыянальнага інстытута адукацыі, рэкамендуе паняцце эпітэта вывучаць у сувяз^з аналізам верша М. Багдановіча "Зімой". Яшчэ ў пачатковай шк&ле ўвагу вучняў звярталі на мастацкія азначэнні і іх ролю ў тэксце. У 5 класе даецца само паняцце **"эпітэт" і** тлумачыцца яго ідэйна-эстэтычная функцыя. Эпітэты - гэта азначэнні, якія ствараюць вобраз, карціну жыцця, перадаюць пачуццё, настрой, выкарыстоўваюцца ў паэзіі і прозе. У лірыцы эпітэт перш за ўсё выражае пэўны настрой, пачуццё, хоць у той жа час служыць сродкам абмалёўкі прадмета, з'явы.

У вершы М. Багдановіча "Зімой" сустракаем эпітэты: "скрыпучы, мяккі снег", "белыя бярозы", "срэбныя рызы снягоў", якія служаць для характарыстыкі прадметаў. Але ў асноўным эпітэты гэтага твора скіраваны на тое, каб выявіць настрой бадзёрай весялосці, выказаць пачуццё радасці жыцця, што асабліва выразна гучыць у заключных радках верша, дзе апісаны палёт санак у зіхатлівым светлым снезе:

Узрывайце ж іх санямі, коні!
Звіні, вясёлых бомаў медзь!
Вакол лятуць бары і гоні,
У грудзях пачала кроў кіпець.

У метадычных даследаваннях можна сустрэць апісанне эксперыментальнай працы, скіраванай на тое. каб вучні глыбей асэнсавалі ролю эпітэтаў у творы. На аркушы паперы надрукаваны два тэксты, дзе ў адным выпадку свядома прапушчаны эпітэты. Пры супастаўленні вучні павінны прыйсці да наступнага вываду: тэкст, пазоаўлены эпітэтаў, уяўляе сабой простае апісакне, з якога мы амаль нічога не даведаліся аб тым, як успрымае карціну жыцця мастак слова, што ён адчувае. Такім чынам. эпітэты не толькі ствараюць яркі і жывапісны маіюнак, але і выражаюць думкі і пачуцці аўтага.

У далеГгшай працы настаўнік будзе паглыбляць паняцце пра эпітот пры зывучэнні твораў розных жанраў.

Згодна праграме, створанай супрацоўнікамі Нацыянальнага інстытута адукацыі, першапачатковае паняцце пра параўнанне вучні атрымліваюць пры вывучэнні ўрыўка з паэмы Якуба Коласа "Новая зямля". Мы ўжо звярталі ўвагу на працэс фарміравання паняцця "параўнанне", калі гутарка ішла пра праграму навукоўцаў з Брэсцкага дзяржуніверсітэта. Цяпер звяртаемся да паралельнай праграмы.

Прачытайце тэкст:

А маладзенькія ялінкі
Пал белым пухам чуць заметны;
Яны так мілы, так прыветны,
Бы тыя красачкі дзяўчынкі,
Надзеўшы южныя апраткі,
Затое ж хвоечкі малыя
Стаяць, як сіраты якія,
Ад снегу выгнуўшысь дугою,
На дах прыпаўшы галавою.

Апісанне зімовага лесу напоўнена яркай выразнасцю. Але задумаемся, чаму, апісваючы ялінкі, паэт стварае жыццярадасны вобраз мілых, прыветных, апранутых у прыгожую вопратку ялінак, а калі гаворыць пра мілыя хвоечкі, то параўноўвае іх з сіротамі. Справа ў тым, што назіральнае вока паэта адкрывае нам тое, што не заўсёды заўважаеш, калі бывает у лесе. Маленькія хвойкі не вытрымліваюць снежнага покрыва і стаяць, "ад снегу выгнуўшысь дугою, на дах прыпаўшы галавою". Значыць, параўнанне нясе ў сабе пэўную думку, выражае настрой і пачуццё.

Праца над эпітэтамі, параўнаннямі, увасабленнямі, метафарамі і іншымі сродкамі моўнай мастацкай выразнасці адбываецца на працягу ўсяго школьнага курса літаратуры. Для таго каб актывізаваць працэс фарміравання, можна дадаткова выкарыстоўваць карткі, дзе вызначаны канкрэтныя заданні і прапануюцца незнаёмыя вучням творы або ўрыўкі з твораў вядомых мастакоў слова, з творчасцю якіх вучні ўжо азнаёміліся.-

У такім выпадку адбываецца перанос ведаў і ўменняў на новы матэрыял, актывізуецца пазнавальная актыўнась школьнікаў.

Навучыць падлетка ўменню разумець, адчуваць значэнне мастацкага слова ў кантэксце твора, унутрана адгукацца на эмацыянальна-зебразны змест слова ў мастацкім творы з'яўляецца асноўнай задачай урока літаратуры.

Аналагічная работа пгаводзіцца і з іншымі тэарэтыка-літаратурнымі паняццямі. вызначанымі праграмай. Іншага шляху фарміравання тэарэтыка-літарутрных паняццяў у школьнай адукацыі няма. Працэс фарміравання таго ці іншага паняцця непасрэдна звязаны з аналітычнлп работай, скіраванай на асэнсаванне ідэйна-

мастацкага зместу твораў. Прапанаваная А. У. Даноўскім канцэпцыя **сістэмна-функцыянальнага фарміравання тэарэтыка-літаратурных паняццяў** застаецца універсальнай і сёння.

У школьным курсе літаратуры ўвага звяртаецца на фарміраванне **асноўных** тэарэтыка-літаратурных паняццяў, звернутых на асэнсаванне **літаратурнага твора як арганічнай еднасці зместу і формы** (сярэднія класы) і **літаратурнага працэсу** як **комплексу ўзаемазвязаных фактараў і з'яў** (гісторыя напісання твораў; мастацкія творы **ў** рукапісах, публікацыях; успрыманне **з'яў** літаратуры чытачамі і крытыкамі; узаемадзеянне літаратуры з іншымі відамі мастацтва, міжлітаратурныя ўзаемасу^зі і інш.). Літаратурны працэс вывучаецца школьнікамі ў старэйшых класах, але гэта не значыць, што на заключным этапе літаратурнай адукацыі не звяртаецца ўвага на стыль мастацкага твора. Літаратурны твор асэнсуецца і аналізуецца на якасна больш высокім узроўні, ва ўзаемадачыненні да іншых з'яў літаратуры і мастацтва ў кантэксце эпохі. На гэтым этапе мы гаворым пра літаратурнае ўзаемадзеянне, творчыя ўзаемасувязі паміж пісьменнікамі адной нацыянальнай літаратуры, а таксама паміж літаратурамі розных народаў, краін, эпох.

У сярэдніх класах, акрамя тропікі (папярэдне мы разгледзелі працэс фарміравання ў школьнікаў паняццяў "параўнанне" і "эпітэт", але ёсць яшчэ метафара, метанімія, гіпербала, літота, іронія, алегорыя, сімвал, гратэск і інш.), вывучаюцца катэгорыі родаў, відаў і жанраў, такія значныя кампаненты зместу і формы мастацкага твора, як тэма, ідэя, сюжэт, кампазіцыя, сістэма вобразаў-персанажаў, рытміка. Вельмі важна не перагружаць памяць вучня ведамі, а імкнуцца да таго, каб веды сталі ўменнямі, каб засвоеныя тэарэтыка-літаратурныя паняцці свядома выкарыстоўваліся школьнікамі ў працэсе аналізу мастацкага твора.

### 3. Фарміраванне тэарэтыка-літаратурных паняццяў у старэйшых класах

У старэйшых класах літаратура вывучаецца на гістарычнай аснозе. таму так важна, каб вучні засвоілі, што гісторыя нацыянальнай літаратуры падзяляецца на эпохі і перыяды. У гісторыі беларускай літаратуры выв>чаюцца дззе *галоуныя* эпо.хі: стлраоеларуская (XI ст. - канец XVIII ст.) і новая беларуская літаратура. якую падзяляюць на літаратуры XIX ст. і XX ст. У сваю чаргу. у кожным перыядзе існуюць этапы развіцця.

Сярод тэарэтыка-літаратурных паняццяў, якія неабходна засвоіць старшакласнікам, два тыпы мастацкай творчасці, **што** праходзяць праз усе літаратурныя эпохі: рэалістычны і рамантычны. Менавіта тыпы мастацкай творчасці прадвызначылі ўзнікненне **мастаіікіх метадаў-** сістэмы гістарычна абумоўленых творчых прынцыпаў, якімі мастакі, блізкія па сваіх ідэйна-мастацгах пазіцыях, кіруюцца пры адборы, абагульненні, ацэнцы і паказе жыццёвых з'яў.

Мастацкія метады, як вядома, выяўляюцца ў розных відах мастацтва (літаратура, жывапіс, скульптура, архітэктура, музыка). У еўрапейскай літаратуры традыцыйна вылучаюцца наступныя мастацкія метады: старажытная літаратура, барока, класіцызм, сентыменталізм, рамантызм, рэалізм, мадэрнізм. Кожны метад мае свае прынцыпы і сродкі адлюстравання рэчаіснасці (паэтыка), галоўных герояў, асноўны пафас.

Разгледзім працэс фарміравання паняццяў **"рамантызм"** у 10 класе. Згодна з праграмай па беларускай літаратуры, складзенай супрацоўнікамі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта, першапачатковае паняцце вучні атрымліваюць тады, калі знаёмяцца з эпохай рамантызму.

Звяртаемся на аглядавым ўроку да перадумовы ўзнікнення рамантызму, аналізуем гістарычныя падзеі, што выклікалі з'яўленне новага метаду ў мастацтве. Гутарка ў першую чаргу ідзе пра падзеі Вялікай французскай рэвалюцыі і тое, што адбылося ў Францыі і іншых еўрапейскіх краінах пасля прыходу да ўлады Напалеона Банапарта.

Замацаванне ўлады буржуазіі амаль ва ўсіх еўрапейскіх краінах праходзіла драматычна, што не магло не ўплываць на дзеячоў мастацтва. Творцы ў мастацтве мукамі шукалі паратунку і натхнення, якіх не маглі знайсці ў рэальным жыцці. Такім чынам, узнікненне рамантызму звязалі з вострай незадаволенасцю сацыяльнай рэчаіснасцю, расчараваннем у ёй і імкненнем да іншага жыцця. да яшчэ не ўбачанага, але такога жаданага ідэалу. Адмаўляючы шэрую будзёнасць, мастакі слова шукалі незвычайныя характары і выключныя абставіны, адлюстроўвалі ў сваіх творах трагічную барацьбу асобы з лёсам. Вытокамі рамантызму з'явіліся строгія каноны класіцызму і "памяркоўнасць" сентыменталізму. Свабола. спрадвечная нязгола з акаляючым асяроддзем становяццз тымі якасцямі, якія высока ацэнены рамантыкамі.

На ўроку даецца і вызначэнне метаду рамантызму як сістэмы лоумоўленых творчых прыкцыпау. Падкрэсліваецца, што для рамантызму важным было не саслоўнае паходжанне чалавека. а яго ўнутраны свет, склад характару. вышыня ідэалаў.

Байран сцвярджае ў творы думку пра неабходнасць свабоды для чалавека і народа і заклікае да актыўнага змагання за волю.

Рамантызм у творчасці Яна Баршчэўскага праяўляецца ў звароце да беларускага фальклору, да духоўнай культуры народа, у фальклорна-міфалагічным змесце апавяданняў.

У творах, што ўвайшлі ў кнігу "Шляхціч Завальня", пануе рамантычная ідэалізацыя народнай паэтычнай стыхіі, захапленне міфалагічнымі ўяўленнямі як асновай народна-паэтычнага погляду на свет.

Уласна фантастычны элемент "Шляхціча Завальні" збліжае гэты твор з рамантычнай традыцыяй у іншых ш/рапейскіх літаратурах (М. В. Гоголь, Э. Г. А. Гофман і інш.). ЯіЛадзначае Л.Тарасюк, "фальклор для Я. Баршчэўскага - не архаіка, а жывая паэтычная рэальнасць. Таму мастацкая свядомасць пісьменніка ў значнай ступені фальклярызаваная".

Фарміраванне ў школьнікаў паняцця "рамантызм" не завяршаецца ў 10 класе. Наступным этапам работы над гэтым паняццем будзе вывучэнне творчасці Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча. Вучні павінны зразумець, што паняцце рамантызму гістарычна зменлівае і на кожным наступным этапе развіцця літаратуры яно набывае новыя фарбы.

Наступны этап работы над засваенне м паняцця "рамантызм" - вывучэнне творчасці Джорджа Гордана Байрана, Генрыха Гейне, Яна Чачота. Адама Міцкевіча, Юльюша Славацкага, Яна Баршчэўскага.

Вядома. паэма Байрана "Паломніцтва Чайльд Гарольда" (1812) стала маніфестам рэвалюцыйнага рамантызму. Наватарствам прасякнуты як змест, так і форма твора, напісанага "спенсаравай страфой". Форма дазволіла Д. Байрану ўзнёсла і рамантычна перадаць шырокае кола пачуццяў, думак і разваг.

У паэме намалявана шырокая панарама сучаснага паэту жыцця. пастаўлены актуальныя праблемы нацыянальна-вызваленчай барацьбы, вайны і рэвалюцыі. сэнсу гістарычнага працэсу і чалавечага быцця.

Герой твора - малады арыстакрат. якому толькі дзевятнаццаць гадо\\ але душа яго спустошанп бессэнсоўнасцю жыцця. Чайльд Гарольд, самотны і расчаравзны, накіроуваецца ў далёкзе падарожжа. бяжыць ад рэалій жыцця. Але няма такой сілы. якая б пазбавіла героя ад меланхоліі. аднавіла яго да жыцця. Так} ю пазіцьі-о не г.адзяляе аўтар твора. які з захапленнем малюе у паэме карціны мужнай барацьбы народаў з захопнікамі. Сімпатыі паэта на

баку албанскіх горцаў, яго хвалюе лёс Грэцыі, гэтай калыскі цывілізацыі, якая растаптана турэцкімі заваёўнікамі.

Рамантызм у творчасці Янкі Купалы праявіўся ў своеасаблівай "абагуленасці", масштабнасці мыслення паэта, у звароце да фальклору, у стварэнні збіральнага вобраза героя, вуснамі якога загаварыла збяднелая сялянская Беларусь.

Рамантызм Я. Купалы - і ў змесце, і ў форме твораў. "Мастак-бытапісец не здолее зрабіць добрай ілюстрацыі да купалаўскага зместу, паэтычная карціна ў Купалы перш за ўсё сімвалічная: курган, дуб - помнікі мужнасці, нязломнасці народнага героя, духу, які жыве ў народзе, і вецер, які "аб мінуўшчым ў жальбах галосе", успрымаецца як вецер гісторыі", - падкрэслівае І. Навуменка.

Такім чынам, фарміраванне тэарэтыка-літаратурных паняццяў на ўроках літаратуры ўзбагачае эмацыйны свет школьнікаў, садзейнічае асэнсаванню імі мастацкіх твораў, развівае літаратурныя здольнасці вучняў.

**Літаратура**


1. Беленький Г. И., Снежнеаич М. А. Изучение теории литературы в средней школе (IУ-Х классы). - М.: Просвещение, 1983.

2. Белыбердин А. Г. Формирование теоретико-литературных понятий в школе (IV—VII кл.). - Киров, 1974.

3. Звягинцева Г. К. Изучение основ науки о литературе в школе: Учебное пособие к спецкурсу. - Л., 1988.

4. Дановский А. В. Системно-функциональное формирование теоретико-литературных понятий в средних учебных заведениях. - М.. 1988.

5. Лазарук М. А. Тэорыя літаратуры ў школе. - Мн., 1971.

6. Лазарук М. А., Ленсу А. Я. Уводзіны ў літаратуразнаўства. - Мн., 1978.

7. Методыка выкладання беларускай літаратуры. - Мн., 1999.

8. Рагойша В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах. - Мн., 2001.


## Пытанні і заданні для самаправеркі

І. Якое месца займае тэорыя літаратуры ў шхольнай літаратурнай адукацыі?

1. У чым вы бачьіце недахопы работы па тзорыі літаратуры у школе'?

3. Рзскрыйце ролю тэарэтыка-літаратурных паняндяў за ўдлскзналенні чытацкага вопыту вучняў, авалоданні імі крь:тэрьіямі ацэккі мастацкіх з'яў.

4. Апішыце сістэму і паслядоўнасць фарміравання тэарэтыка-літаратурных паняццяў на ўроках літаратуры.

5. Раскрыйце паслядоўнасць вывучэння аднаго з тэарэтыка-літаратурных паняццяў.

В. У. Праскаловіч

## ЛІТАРАТУРНАЯ ТВОРЧАСЦЬ ШКОЛЬНІКАЎ

### План лекцыі

1. Асноўныя этапы, сродкі, прыёмы актывізадыі літаратурна-творчай дзейнасці вучняў.
2. Прынцыпы адбору літаратурна-творчых практыкаванняў.
3. Літаратурная творчасць школьнікаў: да гісторыі пытання.

### 1. Асноўныя этапы, сродкі, прыёмы актывізацыі літаратурна-творчай дзейнасці вучняў

Рэформа школьнай адукацыі мае на мэце забяспечыць неабходныя ўмовы для ўсебаковага і гарманічнага развіцця асобы вучня. У ажыццяўленні гэтай задачы асаблівая роля належыць літаратуры. Літаратура - мастацкая творчасць, і вывучэнне яе павінна быць творчым, задавальняць пазнавальную актыўнасць вучняў, уключаць іх у самастойную творчую дзейнасць. Далучэнне школьнікаў да мастацтва праз розныя формы творчасці, шырокі ўдзел у літаратурнай самадзейнасці зможа зрабіць навучанне сапраўды цікавым, стварыць рэальныя магчымасці не толькі для таго, каб захапляцца прыгожым, але і тварыць прыгожае.

У распрацоўцы сучаснай метадалогіі выкладання літаратуры за аснову ўзята "развіццёвае нав\чанне". Тэорыя развіццёзага навучання бярэ свой пачатак у працах Г. Песталоцы, А. Дыстэрвега, К.Дз.Ушынскага, П. П. Блонскага і інш. Сапраўды навуковае абгрунтаванне гэтай тэорыі ўпершыню дадзена на пачатку 30-х гадоў у працах псіхолага Л. С. Выгоцкага. Адзін з важнейшых законаў псіхалогіі, сфармуляваных вучоным, сцвярджае. што навучанне вядзе за сабой развіццё. пры якім улічваюцца як рэальныя магчымасці вучня ("зона актуальнага развіцця"). так і патэнцыяльныя ("зона бліжэйшага развіцця"). Адна з першых спроб практычнай рэалізацыі ідэі развіццёвага навучання была зроблена Л. В. Занковым яшчэ ў 50-60-я гады, але так і не ўкаранілася на той час у школе. Найбольш

поўна і паслядоўна ідэі развіццёвага навучання былі развіты ў рамках псіхалагічнай тэорыі дзейнасці (А. М. Лявонцьеў, П. Я. Гальперын, А. В. Запарожац і інш.), якая не толькі пацвердзіла іх рэалістычнасць і плённасць, але ў канчатковым выніку прывяла да кардынальнага перагляду традыцыйных уяўленняў аб развіцці і яго суадносінах з навучаннем. Уключэнне гэтых працэсаў у кантэкст дзейнасці фактычна азначала адмаўленне ад звядзення развіцця дзіцяці да змяненняў пазнавальных функцый і вылучэнне на першы план яго як суб'екта разнастайных відаў і формаў дзейнасці (В.В.Давыдаў, А. У. Пятроўскі, Д. Б. Эльконін і інш.). Разгорнуты від канцэпцыя развіццёвага навучання набыла ў працах айчыннага педагога І. Ф. Харламава. Вучоным указваецца, што ў залежнасці ад актыўнасці самой асобы, яе творча-пераўтваральнай дзейнасці яна можа фарміравацца ў самых розных напрамках.

У дыдактыцы ёсць прыклады метадычных сістэм, якія накіраваны на развіццё эмацыянальна-эстэтычнай сферы асобы (праз далучэнне да музыкі - Карл Орф, Дз. Б. Кабалеўскі, Л. В. Вінаградаў і інш.; да выяўленчага мастацтва - Б. М. Неменскі, А. А. Мелік-Пашаеў, Ю. А. Палуянаў і інш.; да літаратуры - М. А. Рыбнікава, У.І. Глоцер, М. Р. Качурын, Г. М. Кудзіна. З. М. Наўлянская і інш.; да ўсіх відаў мастацтва адначасова - І. П. Волкаў, М. С. Зайкова і' інш.). Вучонымі (М. М. Бахціным, М. С. Каганам, М. А. Лазаруком, Л. Н. Сталовічам і інш.) даказана, што авалоданне спецыяльна мастацкімі здольнасцямі - неабходная ўмова для гарманічнага развіцця кожнай асобы. Без такіх здольнасцей, па словах Д. Дзідро, "нельга быць ані філосафам... ані звычайным чалавекам".

У Канцэпцыі рэфармавання літаратурнай адукацыі ў сярэдняй школе Рэспублікі Беларусь адзначаецца, што развіццё асобы пры вывучэнні літаратуры адбываецца ў двух асноўных напрамках: развіваюцца агульныя здольнасці і спецыяльна мастацкія. У адпаведнасці з задачамі курса літаратуры ў сярэдняй школе сярод важных відаў навучальнай дзейнасці застаецца літаратурная творчасць вучняў (дэкламацыя паэтычных твораў, вуснае маляванне, ілюстраванне, складанне казак, вершаў. сачыненне па прыказках і т.д.).

У сучасных даследаваннях па методыцы выкладання літаратуры [1] творчая дзейнасць навучэнцаў разглядаецца як умова павышэння маральна-эстэтычнага ўплыву літаратуры на фарміраванне асобы. Далучэнне вучняў да прыгожага, актуалізацыя іх самастойнай творчай дзейнасці з'яўляецца адной з галоўных, вызначальных пазіцый урока літаратуры. Менавіта праз дзейнасць, пры дапамозе дзейнасці вучань і самасцвярджае сябе як асоба, і пазнае, асвойвае мастацкі свет твора. Такім чынам, дзейнасны

падыход - неабходная ўмова і важны прынцып інтэнсіфікацыі навучання літаратуры, стымулявання творчых здольнасцей вучняў. Тэорыя дзейнаснага падыходу да навучання, распрацаваная педагогам! і псіхолагамі, адкрывае шырокія магчымасці для выхавання літаратурна-творчых здольнасцей кожнага вучня без выключэння.

Калі здольнасці вызначаюць агульныя мэты навучання, то крытэрыі літаратурнага развіцця дапамагаюць выявіць яго ўзроўні, рэалізуючы глабальныя асаблівасці здольнасцей у канкрэтных з'явах.

У. Г. Маранцман [2] лічыць самымі важны.\\ наступныя крытэрыі літаратурнага развіцця:

- начытанасць школьнікаў;
- аб'ём тэарэтыка-літаратурных ведаў;
- здольнасць да выяўлення актуальнай сацыяльна-маральнай праблематыкі:
- развітасць успрымання літаратурных твораў на 4-х узроўнях: эмацыянальная чуйнасць, актыўнасць чытацкага ўяўлення, асэнсаванне зместу твора, мастацкай формы;
- уменні аналізаваць тэкст мастацкага твора;
- здольнасці і ўменні, звязаныя з літаратурна-творчай дзейнасцю школьнікаў.

Вопыт навучання дапамагае вучням авалодаць некаторымі ўменнямі літаратурна-творчага характару:

- умением апраўдаць пачуцці, узнікшыя пры чытанні, і знайсці ва ўласным жыццёвым вопыце аналаг сітуацыі твора;
- умением бачыць абставіны дзеяння і ўяўляць партрэт персанажа;
- умением перадаваць дынаміку пачуццяў героя і аўтара ў выразным чытанні;
- умением ацэньваць гульню акцёра ў асобнай сцэне, параўноўваць эпізод эпічнага твора з яго экранізацыяй або ілюстрацыяй да яго;
- уменнем скласці кінасцэнарый або інсцэніроўку па фрагменту літаратурнага тэксту і г.д.

Такім чынам, крытэрыі літаратурнага развіцця кантралююць рэалізацыю здольнасцей у канкрэтных уменіях і дапамагаюць выязіць узроўні засваення вучнямі літаратуры як мастацтва слова.

Сярод крытэрыяў літаратурна-мастацкай падрыхтаванасці школьнікаў Я. В. Квяткоўскі вылучае і авалоданне элементарнымі навыкамі пісьменніцкай працы. Падкрэсліваючы невычэрпнасць тэматыкі і жанравай своеасаблівасці дзіцячай літаратурнай крэатыўнасці. даследчык указвае, што творчыя работы - найважнейшы

сродак актуалізацыі асобаснага ўспрымання мастацкіх твораў, фарміравання і развіцця назіральнасці, фантазіі, чуйнасці мастацкага слова, самавыяўлення і самасцвярджэння асобы [3].

Прадукт разглядаемай намі вучнёўскай літаратурна-творчай дзейнасці можа з'яўляцца новым толькі для яе суб'екта, мець не абсалютную, а вучэбна-выхаваўчую каштоўнасць. Як слушна заўважае выдатны псіхолаг Л. С. Выгоцкі, "важна не тое, што ствараюць дзеці, а важна тое, што яны тэта робяць, ствараюць, практыкуюцца ў творчым уяўленні і яго ўвасабленні".

На думку англійскага псіхолага Г. Уолеса, на шляху літаратурнай творчасці вылучаюцца чатыры фазы, этапы: падрыхтоўка, выспяванне ідэі, азарэнне, праверка ідэі [4].

Услед за В. Р. Бялінскім многія даследчыкі традыцыйна выдзяляюць тры асноўныя стадыі: узнікненне задумы твора, выспяванне і распрацоўку задумы, напісанне твора. Да гэтых традыцыйных стадый, на думку Я. А. Карсунскага, неабходна дадаць яшчэ некалькі этапаў: этап збору матэрыялу, этап зваротнай сувязі, этап дапрацоўкі - перапрацоўкі твора і самаацэнкі твора аўтарам [5]. У найбольш завершаным выглядзе тэхналогія пісьменніцкай працы дадзена ў рабоце А. Г. Цэйтліна [6]. Аўтар вылучае ў працэсе літаратурнай творчасці наступныя этапы: задуму і ідэю будучага твора, збор матэрыялу, планаванне яго, стварэнне вобраза, сюжэт і кампазіцыю, працу над мовай, стварэнне тэксту і перапрацоўку напісанага.

Распрацаваная псіхалінгвістамі мадэль спараджэння маўленчых выказванняў уключае ў сябе наступныя этапы: а) этап матывацыі выказвання; б) этап задумы; в) этап ажыццяўлення задумы (рэалізацыя плана); г) супастаўленне рэалізацыі задумы з самой задумай. Дадзеныя этапы, па словах А. А. Лявонцьева, адпавядаюць структуры любога інтэлектуальнага акта [7].

## 2. Прынцыпы адбору літаратурна-творчых практыкаванняў

Прынцыпамі адбору і сістэматызацыі практыкаванняў, нахіраваных на развіццё ў вучняў літаратурна-творчых уменняў. з'яўляюцца:

1. *Сістэмнасіць вучэбных заданняў.* Гэты прынцып заключаецца ў паступовым ускладненні практыкаванняў.

2. *Варыятыўнасць вучэбных заданняў.* Гэты прынцып заключаема ў тым. што прапануемыя практыкаванні ўлічваюць як рэаль-

ныя магчымасці вучня ("зона актуальнага развіцця")*, так і патэнцыяльныя ("зона бліжэйшага развіцця")*, што вызначае магчымасць самастойнага і разнастайнага выкарыстання атрыманых ведаў у новых умовах.

*3. Дыферэнцыяцыя практыкаванняў.* Гэты прынцып заключаецца ў тым, што літаратурныя здольнасці, абумоўленыя тыпам асобы ("мастак", "мысліцель", "сярэдні" тып, па І.П. Паўлаву), уплываюць на працэс чытання і вызначаюць складанае ўзаемадзеянне розных сфер працы чытача.

4. *Прынцып раздзялення школьнікаў на літаратурна-творчыя групы (ЛТГ).* Гэты прынцып заключаецца ў тым, што, згодна з улікам узроўню літаратурнага развіцця навучэнцаў, іх літаратурна-творчых інтарэсаў і магчымасцей, асобасных якасцей, патрабуецца педагагічная асцярожнасць і такт пры арганізацыі літаратурнай крэатыўнасці кожнага школьніка.

5. *Фарміраванне спосабаў дзеянняў і іх паслядоўнасці* — зыходны прынцып у распрацоўцы методыкі развіцця літаратурна-творчых здольнасцей школьнікаў. Сутнасць развіццёвага навучання, на думку П. І. Підкасістага, заключаецца ў тым, што "вучань не толькі засвойвае канкрэтныя веды, уменні і навыкі, але і авалодвае спосабамі дзеянняў". Развіццёвае навучанне ажыццяўляецца ў форме далучэння навучэнцаў да розных відаў дзейнасці, выкарыстання ў выкладанні метадаў навучання, накіраваных на ўзбагачэнне творчага ўяўлення, мыслення, памяці, маўлення.

6. *Дыяіектычны прынцып адзінства мовы і мыслення.* С.Л.Рубінштэйн тлумачыць дэтэрмінаванасць мовы і мыслення наступным чынам: "Маўленчыя зносіны пры дапамозе мовы - гэта абмен думкамі для ўзаемаразумення. Калі чалавек думае, ён выкарыстоўвае моўны матэрыял, і думкі яго фарміруюцца, выліваючыся ў маўленчыя фармулёўкі".

*7. Прынцып міжпрадметных сувязей:* спалучэнне літаратурнага матэрыялу з іншымі навучальнымі прадметамі. Як адзначае педагог П. І. Підкасісты, "прасоўванне ад рэпрадуктыўнай дзеннасці да творчай прадвызначае абавязковую рэалізацыю міжпрадметных сувязей, паколькі яны ствараюць спрыяльныя ўмовы для развіцця пазнавальных магчымасцей школьнікаў, дазваляюць сродкамі розных прадметаў фарміраваць у іх тзорчае мысленне'". Мэтазгодна вь;карысто5'ваць магчьімасці сумежньіх відаў мастацтва: музыхі. жывапісу, кіно і т.д.. тым оольш. аіто жанравыя іх законы ў многім супадаюць. На думку метадыстаў, спеньіяльныя ззданні па супастаўленні класічных узораў гзтых відаў мастацтва развіваюць

* Т?рмін Л.С.Выгоцкагз.

творчае асацыятыўнае мысленне дзяцей, іх эстэтычны густ, садзейнічаюць больш глыбокаму спасціжэнню законаў мастацкай творчасці ўвогуле [8].

Зыходзячы з дадзеных прынцыпаў, прапануем наступную сістэму практыкаванняў, якая будзе садзейнічаць актывізацыі мысліцельнай, пазнавальнай і літаратурна-творчай дзейнасці навучэнцаў, выхаванню іх эстэтычных густаў.

Усе практыкаванні па характару дзейнасці навучэнцаў размеркаваны на тры асноўныя групы: а) *рэпрадуктыўныя;* б) *творчыя*; в) *літаратурна-мастацкія (пісьменніцкія)*. Да ліку першых аднесены: пераказ (падрабязны, сціслы, выбарачны), гутаркі па змесце твора, складанне розных відаў планаў і інш., дзе галоўнай з'яўляецца ўзнаўляльная дзейнасць.

Да групы творчых практыкаванняў, выкананне якіх звязана з актывізацыяй творчага ўяўлення, асадыятыўнага, вобразнага мыслення, маўленчых здольнасцей, адносяцца наступныя: выразнае (мастацкае) чытанне, славеснае маляванне, мастацкае расказванне, розныя віды творчых пераказаў, інсцэнгравanne, мізансцэніраванне, стварэнне кадрапланаў, літаратурныя гульні і інш.

Да трэцяй групы — практыкаванні і заданні, накіраваныя на актывізацыю ўласна пісьменніцкіх здольнасцей (стылістычны эксперымент; складанне слоўнікаў; напісанне казак, прыказак і прымавак, загадак, апавяданняў, вершаў; падрыхтоўка вусных і пісьмовых сачыненняў-разважанняў; водгукаў аб самастойна прачытаным творы, аб творы выяўленчага мастацтва, прагледжаным кінафільме, тэлеперадачы (з матывіроўкай сваіх адносін да герояў і падзей твораў і інш. ) і ўдасканаленне моўнай кампетэнцыі школьнікаў (самааналіз, узаемарэцэнзаванне, праўка напісанага).

Заданні дыферэнцуюцца згодна з прынцыпам раздзялення навучэнцаў на ЛТГ і абумоўлены тыпам асобы ("мысліцель", "сярэдні", "мастак"). Першы тып практыкаванняў арыентаваны на работу з вучнямі, для якіх характэрны высокі ўзровень узнаўляльнага ўяўлення. аднак скаваных ў творчым уяўленні; другі тып — ^ірактыкаванні разлічаны на вучняў, для якіх характэрна адносная раўнавага ўзнаўляльнага і творчага ўяўлення; трэці тып практыкаванняў для вучняў-чытачоў, якія праяўляюць высокі ўзровень узнаўляльнага ўяўлення і актыўнасць творчага ўяўлення.

Гэтыя віды прадметна-творчай дзейнасці міжвольна ставяць зучнл ў пазііію аўтара і творцы, развіваюць навыкі аналізу і сінтэзу, выхоўваюць назіральнасць і чуйнасць да слова. Па выкіках выкананання такіх заданняў можна меркаваць пра ступень развітасці літаратурна-творчьіх здольнасцей навучэнцаў і кіравацца гэтым у

далейшай дзейнасці. Акрамя таго, ажыццяўляецца запамінанне пры "навучанні з захапленнем" [9].

### 3. Літаратурная творчасць школьнікаў: да гісторыі пытання

Педагагічнай і метадычнай навукай неаднаразова рабіліся спробы стварыць сістэму развіцця літаратурна-творчых здольнасцей школьнікаў у працэсе вывучэння літаратуры. Так, яшчэ ў сярэдзіне XVIII стагоддзя М. В. Ламаносаў стварыў першы навуковы дапаможнік для літаратурнага навучання юнацтва. На працягу стагоддзя з'явіліся курсы рыторыкі М. Ф. Кашанскага, А. Ф. Мерзлякова і іншых аўтараў, якія былі, па сутнасці, выкладам правілаў і прыёмаў літаратурна-творчага развіцця навучэнцаў.

Пачаткам методыкі сачыненняў і літаратурнай творчасці школьнікаў даследчыкі [10] лічаць 1759 год - дату выхаду першага нумара часопіса для дзяцей "Праздное время, в пользу употреблённое".

Прагрэсіўныя выкладчыкі мінулага вялі актыўную барацьбу за развіццё літаратурна-творчых здольнасцей вучняў. Гаворачы пра гэта, мы маем на ўвазе перш за ўсё дзейнасць вучоных-педагогаў У.Я. Стаюніна, В. І. Вадавозава, Н. Ф. Бунакова, В.П. Астрагорскага, Ц. П. Балталона, нашых айчынных педагогаў Алаізы Пашкевіч (Цёткі), Канстанціна Міцкевіча (Якуба Коласа).

У працах вучоных выказваецца думка аб тым, што развіццё эстэтычнага пачуцця цесна звязана з праявай творчых інтэнцый дзіцяці. Асэнсаванне гэтай залежнасці стымулявала даследчыкаў заняцца вывучэннем псіхалогіі дзіцячай творчасці. Вывучэнню літаратурнай творчасці школьнікаў прысвечаны працы І.М.Салаўёва, В. Воранава, С. Крукава і інш. Але даследчыкі адзначалі, што, на жаль, "у школьным пылу і мітусні губляюцца гэтыя добрыя зярняты дзіцячай літаратурнай творчасаі".

Прыгадваючы школьную адукацыю XIX ст., неабходна адзначыць, што сістэматычны курс развіцця літаратурна-творчых здольнасцей (ЛТЗ) школьнікаў у тыя часы не мог скласціся, у прыватнасці, у выніку недаацэнкі індывідуальнага, асабовага ў педагогіцы. а таксама метадалагічнай накіраванасці навучання на развіццё пераважна выканальніцкіх якасцей асобы навучэнца. Менавіта ў выніку палемікі з "генераламі ад народна» асзеты", якія насаджалі сваёй дзейнасцю сляпую пакорлівасць і пасіўнасць, выступалі супраць стымулявання творчых інтэнцый асобы, нарадзілася педагагічная сістэма Л. М. Талстога. У 185° годзе ён

арганізаваў школу, якая працавала на падставе прынцыпаў непрымусовага выхавання. Свабоду і свабоднае развіццё асобы Талстой разглядаў як аснову жыццядзейнасці школы. Леў Мікалаевіч быў цвёрда перакананы: без творчага развіцця немагчыма ўратаваць тых шматлікіх пушкіных і ламаносавых, якіх штодзень засмоктвае багна школьнай паўсядзённасці. Ён бачыў вялікую небяспеку ў становішчы, калі дзіця пазбаўлялася магчымасці вучыцца тварыць, бо, пасталеўшы, такі чалавек і ў сваім працоўным жыцці па болынасці заставаўся ні кім іншым, як пераймальнікам-капіравальнікам. Уласныя жыццёвыя назіранні прывялі Л. М. Талстога да высновы: людзі, якія навучыліся капіраваць, не здольныя на творчую працу, на практычнае прымяненне атрыманых у школе ведаў і ўменняў. Распрацаваныя ім рэкамендацыі скіраваны на тое, каб педагог мог эфектыўна спрыяць развіццю ў дзіцяці творчых пачаткаў. Карыснай для сучасных настаўнікаў літаратуры з'яўляецца работа Л. М. Талстога "Каму ў каго вучыцца пісаць: сялянскім дзецям у нас ці нам у сялянскіх дзяцей?" [11].

Актуальнымі для школы XXI ст. засталіся выказванні Л.М. Талстога адносна стварэння найспрыяльнейшых умоў для развіцця творчых магчымасцей навучэнцаў. Асветнік раіць педагогу даваць болып творчых заданняў (бо галоўнае — больш чытаць, разумеючы тое, што чытаецца; больш пісаць "з галавы", па падзеях, якія адбыліся з самімі вучнямі і г.д.). Лепш за ўсё дзіця піша аб тым, што вельмі цікавіць яго, асабліва калі ён у гэтым разбіраецца.

Галоўнае мастацтва настаўніка з мэтай кіраўніцтва дзіцячай літаратурнай творчасцю, па прызнанні Л. М.Талстога, не столькі ў задаванні тэм сачыненняў, колькі ў прадстаўленні вялікага выбару іх, у паказе першапачатковых прыёмаў "сачыніцельства". І галоўнае — каб стварыць у вучня патрэбнасць у пісанні, неабходна даваць яму стымулы. На падставе свайго педагагічнага вопыту пісьменнік робіць наступныя вывады:

- прапаноўваць самы вялікі і разнастайны выбар тэм, не выдумляючы іх спецыяльна для дзяцей, але прапаноўваць тэмы самыя сур'ёзныя і цікавыя для самога настаўніка;

- д/ваць дзецям чытаць дзіцячыя сачыненні, і толькі дзіцячыя сачыненні прапаноўзаць за ўзоры, бо яны заўсёды болып праўдзівыя, больш зграбныя і маральныя, чым сачыненні дарослых;

- ніколі ў час разглялання дзіцячых сачыненняў не рабіць вучням заўваг ні накент зыгляду сшыткаў, ні наконт каліграфіі і г.д.;

- у сачыніцельстве цяжкасць заключаецца не ў аб'ёме або змесае. а ў мастацхасці т?мы, то паступовасць тэм павінна заключацда не ў аб'ёме, не ў мове, а ў механізме справы... .

Усведамляючы сваю адказнасць за развіццё літаратурнай творчасці вучняў, Талстой шмат увагі, часу і намаганняў скіроўваў на насычэнне навучальных кніг тэкстамі, якія адпавядаюць чытацкім інтарэсам дзяцей, актывізуюць іх творчы пачатак. Каштоўныя навучальныя кнігі "Азбука" (1872) і "Новая азбука" (1875), створаныя пісьменнікам на аснове прынцыпу прыродазгоднасці, уключаюць у сябе разнастайныя тэксты фальклорных жанраў (казкі, прыказкі, песні, загадкі, легенды). На думку Л. М. Талстога, фальклор - важны сродак актывізацыі літаратурна-творчых здольнасцей вучняў, пра што сведчаць дзіцячыя творы, надрукаваныя на старонках часопіса "Ясная Паляна".

Са зменамі ў савецкую эпоху сацыяльнай функцыі школы патрэбнасць у цэласнай сістэме развіцця літаратурна-творчых здольнасцей адчуваецца яшчэ больш востра. "Мы вельмі мала звяртаем увагі, —зазначала Н. К. Крупская, — на тое, каб навучыць пісаць (літаратурныя творы. — В.П.) нашых вучняў. Я не ведаю, ці ёсць якая-небудзь кніга, якая магла б гэтаму навучыць, а між тым неабходна даваць вучням рад практыкаванняў, якія дапамаглі б ім авалодаць тэхнікай творчасці. Я думаю, што гэта задача — стварыць такі падручнік і паставіць такі курс, які дапамог бы сучаснаму вучню навучыцца пісаць, — адна з найважнейшых задач, якая стаіць перад выкладчыкамі літаратуры ва ўвесь рост".

20-30-я гады сталі часам цікавых метадычных знаходак, бясконцых эксперыментаў у педагогіцы і методыцы; гэты час характарызуецца інтэнсіўнымі пошукамі новых дыдактычных прынцыпаў, вызначэннем зместу адукацыі ў школе, стварэннем для яе праграм і падручнікаў.

Працоўны характар агульнаадукацыйнай школы 20-30-х гг. XX стагоддзя разумеўся ў першую чаргу як рэалізацыя дзейснага, творчага падыходу да навучання, у тым ліку і літаратурнага.

Аб актуалізацыі дзейснага, творчага падыходу да літаратурнага навучання аўтар першай "Методыкі роднае мовы" (1920) К. М. Міцкевіч (Якуб Колас) зазначаў: "Да пасіўнай, параўнаўча, работы далучаецца і дзейсная творчая работа: з чытача вучань перароблівецца часам у пісьменніка — ён спрабуе сам выразіць з дапамогай таго ж роднага слова, якому ён вучыўся. вынік перадуманага і перажытага, як бы яны ні былі яшчэ няспелымі. Вучань спрабуе выкарыстаць свае роднае слова як інструмент свайго розуму і думкі".

Другое выданне "Методыкі..." (1930) было падрыхтазана Якл бдм Коласам у сааўтарстве з вядомым метадыстам В.П. Тэпіньім. Значная ўвага ў дапаможніку надаецца мастаикап самадзейнасці вучн.чў. Акрамя пераказу. выняткаў з прачытанага. прапануюцца

практыкаванні ў "насьледаваньні літаратурных узораў". Арыгінальнай працай па абуджэнні самастойнай творчасці школьнікаў з'яўляюцца практыкаванні, накіраваныя на актывізацыю іх асацыятыўнага мыслення, уяўлення. Развіццё творчага мыслення і цесная сувязь яго з авалодваннем роднай мовай былі вылучаны Коласам у асаблівую задачу навучання і выхавання. Заслугоўвае пільнай увагі вопыт работы Коласа-педагога, які своеасабліва акумуляваў у сабе індывідуальныя і калектыўныя здабыткі папярэднікаў і сучаснікаў, абгрунтаваў мэтазгоднасць усебаковага развіцця асобы школьніка.

Вядомы літаратуразнаўца і метадыст І. І. Замоцін лічыў літаратурна-творчую самадзейнасць адным з вядучых момантаў школьнай літаратурнай адукацыі. Два выпускі яго метадычных нарысаў "Мастацкая літаратура ў школьным выкладанні" (1927 - 1928) - першая навуковая праца па методыцы выкладання беларускай літаратуры. На погляд вучонага, можна формулу школьнай літаратурнай асветы звесці да наступных момантаў: 1)развіццё літаратурнай мовы; 2) літаратурная начытанасць; 3) ідэйна-мастацкі аналіз літаратурнага матэрыялу; 4) літаратурна-творчая самадзейнасць вучняў. Важнасць чацвёртага моманту ва ўмовах працоўнай школы, па словах Замоціна, відавочная. Ён пісаў: "Школа, зразумела, не выхоўвае спецыяльна паэтаў, якія аперыруюць мастацкім стылем, але яна выхоўвае ў шырокім сэнсе працаўнікоў культуры, для якіх мастацкі стыль не толькі павінен быць зразумелым, але і даступным для выкарыстання ў практыцы іх штодзённага жыцця, бо кожны павінен умець да некаторай ступені маляўніча выявіць прадукты свайго і чужога мыслення і кожны павінен умець сродкамі эмацыянальнай мовы гаварыць аб сваіх і чужых пачуццях... Гэта дыктуецца і укладам сучаснага жыцця, калі жывое слова, апранутае ў яркую і вобразную форму, з'яўляецца фактарам у грамадскай працы " [12].

Гэта найважнейшае патрабаванне часу даволі энергічна спрабавала ажыццявіць школа ў 20-30-я гады. І, трэба сказаць, небеспаспяхова. *Як* слушна заўважае акадэмік М, А. Лазарук, менавіта дзейсны творчы падыход да навучання, у тым ліку і літаратуры, быў адной з прычын (няхан і не галоўнай) таго, што ў гэтыя гады назіраваўся шырокі прыток моладзі ў літаратуру. Прыгадаем "Маладняк" з яго шматлікімі раённымі "філіяламі".

Тэарэтычныя праблемы творчага выкладання літаратуры ў школе ставяцца ў метадычных працах М. М. Сакалова, М. А. Рыбнікавай. В. В. Галубкова і інш.

Так, асноўнае месца ў метадычнай сістэме М. М. Сакалова адводзіцца развіццю літаратурна-творчых здольнасцей школьнікаў.

разнастайным відам пісьмовых прац. Яго кніга "Вуснае і пісьмовае слова навучэнцаў" (1927), заснаваная на практичным вопыце аўтара, змяшчае сістэму практыкаванняў па развіцці маўлення, якія прадугледжваюць апору на жыццёвыя ўражанні школьнікаў. Метадыст не наследуе пры гэтым традыцый, адвяргаючы пераказы, перайманне ўзораў, сачыненні па аналогіі; лічыць неабходным перш-наперш стымуляванне творчых здольнасцей навучэнцаў, іх творчага мыслення і ўяўлення [13].

Вялікі ўклад у развіццё метадычнай навукі 20-40-х гадоў зрабіла выдатны педагог і метадыст М. А. Рыбнікава. Асаблівае значэнне вучоны-метадыст надае творчай самадзейнасці навучэнцаў. У лісце да М. Горкага (ад 20.09.1931 г.) яна пісала: "Тое, што Вы робіце ў Вашай вялікай працы з рабкорамі і аўтарамі-пачаткоўцамі, я раблю ў больш вузкіх школьных рамках. Я вучу пісаць нашага... школьніка і паказваю прыёмы гэтай справы. Я — метадыст..." [14]. У канцы 20-х гадоў М. А. Рыбнікава задумвае кнігу аб творчых сачыненнях "Славесная творчасць як прадмет методыкі", у якую павінны былі ўвайсці апублікаваныя ў часопісах артыкулы "Ад маленькага пісьменніка - да вялікага чытача" (1929), "Пастаноўка творчых прац" (1930). "Культура вобраза" (1930), "Творчыя сачыненні як прадмет методыкі" (1930), "Гісторыя шасці дарог (да пытання аб творчых сачыненнях)" (1934). У артыкулах прапаноўвалася стройная сістэма творчых прац. І толькі праз дзесяць год у перапрацаваным выглядзе гэтыя артыкулы былі ўключаны ў кнігу "Нарысы па методыцы літаратурнага чытання" (1941). Вышэйшай праявай актыўнасці навучэнцаў метадыст лічыць іх творчую самадзейнасць, стымулюемую вывучэннем літаратуры. Ідэя, сфармуляваная М. А. Рыбнікавай, была, несумненна, плённай і перспектыўнай, знайшла адлюстраванне ў працах паплечнікаў (В. В. Галубкоў, М. І. Кудрашоў і інш.). Але ў практыцы тагачаснай школы па многіх прычынах яна ў цэлым і не магла быць рэалізавана. Літаратурна-творчая дзейнасць вучняў была амаль цалкам перанесена на пазаўрочную работу, г. зн. стала неабавязковай. І методыка развіцця літаратурна-творчых здольнасцей шмат што страціла.

Вялікі уклад у распрацоўку метадалогіі творчага навучання зрабілі працы В. А. Сухамлінскага. Здольнасці В. А. Сухамлінскага як педагога-даследчыка і публіцыста праявіліся ў 50 - 70-я гады. Менавіта таль: выйшаў шэраг яго кніг. А манаграфія "Паўлышская сярэлняя школа" адлюстразала плённыя намаганні педагагічнага калектыву па выхаванні ўсебакова развітай асобы. Тут - шматгадовы вопыт педагагічнай працы на пасадзе дырэктара Паўлышскай сярэдняй школы Кіраваградскай вобласці. Навучальная дзейнасць у школе Сухамлінскага была пастаяннай творчасцю настаўнікаў і вучняў.

Выкарыстоўваліся ўсе даступныя школьнікам формы творчасці: сачыненні казак-мініяцюр (з першага да выпускнога класаў), падрыхтоўка і выступление з дакладамі, рэфератамі, анатацыямі кніг і г.д. Сухамлінскі лічыў, што "калі падлетку не даць магчымасць рабіць штосьці творчае, то ён наогул не стане вучыдца". Метады і прыёмы навучання В. А. Сухамлінскі ацэньваў у залежнасці ад таго, наколькі яны актывізуюць, стымулююць пазнавальны працэс у вучэнні; фарміруюць у школьнікаў уменне назіраць, параўноўваць, супастаўляць, адчуваць, запамінаць, фантазіраваць; наколькі яны садзейнічаюць авалоданню вучнямі прыёмамі актыўнай мысліцельнай дзейнасці. Найбольш удзячнымі ўмовамі для актывізацыі літаратурна-творчых здольнасцей вучняў з'явіліся назіранні за прыродай і прадметамі навакольнага асяроддзя. "Падарожжы да крыніцы думак і слова" ў прыроду сталі пастаяннымі ў практыцы работы Паўлышскай школы. Ролю назіранняў В.А.Сухамлінскі звязваў з развіццём мыслення і мовы. У працэсе такіх назіранняў у дзяцей узнікае жаданне перадаць свае пачуцці і перажыванні: "у такія хвіліны думка просіцца ў слова" [15]. Школа павінна стаць, па сцвярджэнні Сухамлінскага, домам радасці і майстэрняй творчасці. У дзяцінстве - кожны паэт, кожны мастак. Але творчасць становіцца духоўнай, эмацыянальнай патрэбай дзяцей толькі тады, калі дарослыя дапамогуць адкрыць ім усё харaство жыцця, прыроды, прыгажосці слова. "Як любоў да музыкі нельга выхаваць без гучання музыкі, - гаворыць Сухамлінскі, - так любоў да творчасці нельга выхаваць без адчування роднага слова, яго красы, мілагучнасці і чарадзейства". На думку педагога, перажыванне прыгажосці немагчыма без фантазіі, без асабістага ўдзелу дзяцей у творчасці, імя якому - казка. "Казка - гэта актыўная эстэтычная творчасць, якая захапляе ўсе сферы духоўнага жыцця дзіцяці - яго розум, пачуцці, уяўленне, волю. Яна (творчасць. - В.П.) пачынаецца ўжо ў расказванні, вышэйшы яе этап - інсцэнізацыя". У кнізе "Сэрца аддаю дзецям" В. А. Сухамлінскі выклаў свой погляд на ролю казкі ў развіцці асобы дзіцяці, у абуджэнні яго літаратурна-творчых памкненняў. Па словах Сухамлінскага, "стварэнне казак - адзін з самых цікавых для дзяцей відаў паэтычнай творчасці. Разам з тым гэта важны сродак разумовага развіцця". Выдатны педагог пераканаўча сцвярджае: "Вучань павінен жыць у свеце творчасці. Без гэтага ён засушаная кзетка".

Не без дабратворнага ўплыву Сухамлінскага далучыўся да жыцця школы, да складаных праблем літаратурнага развіцня вучняў патрыярх беларускай дзіцячай літаратуры Васіль Вітка (Цімох Васілевіч Крысько). У мастацка-публіцыстычных кнігах "Дзеці і мы", "Урокі", "Азбука душы" выкладзены асноўныя палажэнні

створанай В.Віткам педагагічнай сістэмы. У ёй улічаны вопыт Канстанціна Ушынскага, Антона Макаранкі, асабліва блізкія яму педагагічныя навацыі Васіля Сухамлінскага. Звяртаецца таксама В.Вітка і да тэорыі апорных сігналаў Віктара Шаталава, бо, як дзіцячы пісьменнік, ён пераканаўся, якое значэнне мае для дзяцей эмацыянальны фактар, уменне актывізаваць іх вобразнае мысленне, фантазію. В. Вітка звяртае ўвагу на тое, як многа магчымасцей не выкарыстоўваецца нашай школай у самым галоўным - у заахвочванні, у стымуляванні творчай і эмацыянальнай актыўнасці кожнага вучня. Не будучы педагогам па спецыяльнасці, В.Вітка пайшоў у школу, дзе стаў весці ўрокі, не прадугледжаныя праграмай: урок вясёлай матрматыкі, урок хітрага слова, урок кэзкі і інш. Многія з гэтых урокаў перадаваліся па тэлебачанні. Сваімі ўрокамі Васіль Вітка сцвярджае ідэю развіццёвага навучання, з захапленнем, з радасцю: "Кожны школьны ўрок, калі творча разумець яго, - гэта чарадзейнае, казачнае царства ведаў, таямніц і адкрыццяў" [16]. Нельга не сказаць і пра тое, што ўвага пісьменніка і прыроджанага педагога сканцэнтравана на ролі сродкаў фальклору ў развіцці гарманічна развітай асобы. Ідучы ўслед за Сухамлінскім, Васіль Вітка шырока прапагандуе казку дзеля актывізацыі літаратурнай крэатыўнасці дзяцей. Захоплена расказваючы пра тое, што дзеці ў Паўлышскай школе складаюць казкі, са шкадаваннем адзначаў: "Уся бяда, што ў большасці нашых школ мала хто з настаўнікаў за сваё жыццё сам напісаў, склаў казку!" Сёння яшчэ большую каштоўнасць і актуальнасць набылі ўсе тры кнігі В.Віткі, як і яго педагагічная сістэма. Сваёй сутнасцю канцэпцыя Васіля Віткі-педагога зарыентавана на асобу вучня, на эмацыянальна-дзейнасны падыход у навучанні і выхаванні дзяцей, на развіццё творчых здольнасцей не толькі вучня, але і настаўніка.

Доўгі час у савецкай псіхалогіі, дыдактыцы і методыцы выкладання літаратуры не было адзіных поглядаў на мэтазгоднасць, шляхі і сродкі развіцця літаратурна-творчых здольнасцей школьнікаў, што з'явілася галоўнай прычынай адсутнасці да апошняга часу цэласнай сістэмы такой працы.

У распрацоўцы навукова абгрунтаванай методыкі развіцця літагатурна-творчых здольнасцей школьнікаў сучасныя вучоныя (В. У. Івашын. М. А. Лазарук, Н. Дз. Малдаўская. У. Г. Маранцман і інш.[1] лбапіраюцца на прапанаваную псіхалзгічнаГі навукаГі ідэю. што спецыяльныя здольнасці звязаны з пэўным відам чалавечай дзейнасці і таму — з ажыццяўленнем спецыяльных аперацый, спецыфічных для гэтага зіду дзейнасці. Таму большасцю метадыстаў прызнаецца той факт, што неабходнай умовай

стымулявання літаратурна-творчых здольнасцей вучняў з'яўляецца непасрэднае далучэнне іх да працэсу літаратурнай працы.

Аднак у методыцы выкладання літаратуры існуюць розныя падыходы да названай праблемы.

Адны даследчыкі лічаць, што вывучэнне тэхнікі літаратурнай працы — справа шкодная. Як зазначае У. І. Глоцер, "сакрэтаў майстэрства гэта не адкрые, але навўчыць рамяству. А рамяство згубна для паэтычнага таленту" [17]. Другія рэкамендуюць навучаць "пісьменніцкай" працы школьнікаў. Яшчэ М. А. Рыбнікава зазначала, што "давесці навучэнцаў да стану здзіўлення перад тытанічнай магутнасцю Талстога, перад геніяльнай думкай Пушкіна магчыма толькі ў тым выпадку, калі вы саміх навучэнцаў прымусіце выпрабаваць сілы хаця б на вельмі простай працы". Менавіта ў дачыненні да сярэдніх класаў даследчыцай быў сфармуляваны тэзіс: "Ад маленькага пісьменніка — да вялікага чытача", які прадугледжваў шырокую практыку літаратурна-творчых работ, выпрацоўку тэхнікі пісьма твораў розных жанраў, з мэтай болыы глыбокага пазнання таямніц мастацтва слова. Сёння гэты тэзіс актуалізуецца пасля вядомага ў гісторыі доўгага перыяду панавання дагматычнай, нятворчай методыкі. Вядома ж, М. А. Рыбнікава не недаацэньвала патрэбы рыхтаваць у вучню чытача, не дапускала і ценю ілюзій адносна таго, што кожны вучань стане літаратарам. "Калі з нашых класаў выйдуць пісьменнікі і славеснікі, - пісала М. А. Рыбнікава,- гэта добра, але не на гэта мы разлічваем. Наша справа - падрыхтаваць чытача, які моцна адчувае і крытычна мысліць" [18]. На думку педагога А. М. Топарава, не выключаны і такі шлях: ад маленькага пісьменніка - да вялікага пісьменніка. "Мы павінны выхоўваць не толькі чытача, але і будучага пісьменніка. Не з неба ж валяцца літаратары!" [19]. Але незалежна ад таго, ці стануць школьнікі вялікімі пісьменнікамі, — час. аддадзены імі ў школьныя гады паэтычнай творчасці, не пройдзе для іх марна. Яны навучацца разумець мастацтва слова і ў нейкай ступені валодаць ім, у іх жыццё ўвойдзе радасць творчасці — пачуццё, якое чалавек, аднойчы зведаўшы, захавае назаўсёды, кім бы ні быў.

Аб важнай ролі літаратурнай тэхнікі ў творчым працэсе гаварылі многія паэты і пісьменнікі [20]. Па словах Максіма Горкага, "можна многа бачьшь. чытаць. можна што-небудзь уявіць, але, каб зрасіць. — неабходна ўмець. а умение даецца толькі вывучэннем тэхкікі". Аб шляхах вывучэння тэхнікі літаратурнай працы пісаў Уладзімір Маякоўскі: "Навучакне паэтычнай працы — не вывучэнне пэўкага. аб.межаванагл тыпу пдэтычных рэчаў, а вывучэнне спосабаў усякай паэтычнай працы. вывучэнне вытворчых навыкаў, якія дапамагаюць ствараць нозыя".

Актуалізуючы ролю тэхнікі літаратурнай працы, вядомы настаўнік-славеснік Я. М. Ільін раіць пераносіць на методыку ўрока літаратуры спосабы, якімі карыстаюцца пісьменнікі ў сваёй дзейнасці. "Ці можна ўмела дакрануцца да вялікіх (майстроў слова. - В. ГГ.) з іншых пазіцый?" - ставіць пытанне ён і адказвае: "Калі славеснік збянтэжана баіцца такой "роўнасці", свет вялікага (пісьменніка. - В. *П.)* і самі яго кнігі закрыты перад ім. І ніхто: ні знакамітыя крытыкі, вядомыя літаратуразнаўцы, вучоныя-літаратары - гэтага свету і гэтых кніг за яго не адкрыюць".

Меркаванні метадыстаў, педагогаў, майстроў слова можна прывесці да адзінай думкі: удасканальванне літаратурнай тэхнікі з'яўляецца неад'емнай часткай літаратурнага творчага працэсу, без авалодання тэхнікай літаратурнай працы не можа быць і размовы аб паспяховым развіцці літаратурных здольнасцей. Значыць, навыкі літаратурнай працы, валоданне літаратурна-творчымі ўменнямі і прыё'мамі з'яўляецца неабходнай умовай развіцця ўласна мастацкіх здольнасцей школьнікаў. Такім чынам, навучанне "пачынаючых аўтараў" тэхніцы літаратурнай працы можа стаць адным са стымулаў развіцця іх літаратурна-творчых здольнасцей.

У вырашэнні гэтай заданы несумненную дапамогу настаўніку можа аказаць распрацаваны Я. А. Карсунскім спецкурс "Псіхалогія літаратурнай творчасці школьнікаў". Гэты спецкурс, на думку аўтара, павінен дапамагчы настаўніку ажыццявіць кіраўніцтва літаратурнай творчасцю школьнікаў [21]. Аднак, на наш погляд, заданы спецкурса абмежаваны. З аднаго боку, настаўнік пазнаёміцца з псіхолага-педагагічнымі перадумовамі арганізацыі літаратурнай крэатыўнасці школьнікаў, што таксама неабходна ў мэтах удасканалення сістэмы літаратурна-творчага развіцця навучэнцаў у сярэдняй школе, з другога боку,- не менш важнай застаецца метадычная падрыхтоўка настаўніка, які ажыццяўляе развіццё творчых здольнасцей вучняў. Метадычная сістэма развіцця творчых інтэнцый школьнікаў у дапаможніку, на жаль, не разглядаецца.

Наступнай умовай інтэнсіфікацыі працэсу развіцця літаратурна-творчых здольнасцей школьнікаў з'яўляецца фарміраванне адпаведнай патрэбнасна-матывацыйнай сферы.

Як слушна заўважае даследчык псіхалогіі дзіцячай творчасці Л. С. Выгоцкі, "мы можам стымуляваць і накіроўваць творчую рэакцыю дзяцей" [22]. Вучокыя даўно ўстанавілі шэраг прыёмаў, якія служаць гэтай мэце — абудзіць творчую думку дзяцей. Для гэтага задаюцца дзецям пэўныя заданні ці тэмы. прапануецца рад уражанняў: музычных. жывапісных, узятых з рэальнасці; г.д. Адках, па словах Л. С. Выгоцкага, усе гэтыя прыёмы штучныя: і ўсе якы сдужаць толькі адной мэце — менавіта выклікаць такую рэакцыю ў

дзяцей, якая паслужыла б добрым матэрыялам для вывучэння. І зусім іншыя заданы стаяць перад педагагічным стымуляваннем дзіцячай творчасці. Тут задача іншая, таму іншыя і прыёмы. Найлепшым стымулам дзіцячай творчасці з'яўляецца такая арганізацыя жыцця і асяроддзя, якая стварае патрэбнасці і магчымасці дзіцячай творчасці.

Навукова-педагагічны вопыт і школьная практыка назапасілі вялікі арсенал сродкаў, форм і прыёмаў, якія стымулююць літаратурную творчасць школьнікаў. Як слушна заўважаюць метадысты (гл. працы І. І. Аркіна, М. А. Лазарука, У. Г. Маранцмана, В. І. Смыкоўскай і інш.), у працэсе ўспрымання мастацкіх твораў неабходна як мага шырэй выкарыстоўваць розныя прыёмы і тыпы заданняў, накіраваных на развіццё такіх чытацкіх якасцей, як назіральнасць і развітае ўзнаўляльнае ўяўленне, пачуццё паэтычнага слова, здольнасць да суперажывання, уменне спасцігнуць абагульняльны сэнс славесных вобразаў, ацэньваць прачытаныя мастацкія творы з пэўных эстэтычных пазіцый. На погляд акадэміка М. А. Лазарука, "менавіта такая работа будзе ўводзіць вучняў у таямніцы літаратурнай творчасці, будзе спрыяць і развіццю чытацкай цікавасці, усвядомленаму ўспрыманню літаратуры" [23]. Таму перад настаўнікам-славеснікам паўстае задача — арганізаваць самастойную творчую дзейнасць вучняў, кожнага вучня без выключэння.

Між тым аналіз метадычных знаходак творча працуючых настаўнікаў славеснасці сведчыць, што авалоданне школьнікамі літаратурна-творчымі ўменнямі, навыкамі тэхнікі літаратурнай працы адбываецца ў асноўным у пазакласны час.

Пазакласная ж работа, дзе ў асноўным і прадугледжана літаратурна-творчая дзейнасць, вучэбнай праграмай, як вядома, не рэгламентуецца. І хоць у некаторых школах маецца досыць цікавая падобная практыка, што яскрава пацвярджае і вопыт лепшых айчынных настаўнікаў (А. І. Белакоз, М. У. Верціхоўская, А. В. Руцкая, В. М. Туркевіч і інш.), усё ж улічваць яе як састаўную частку літаратурнага навучакня немагчыма па прычыне яе неабавязковасці. Усё тут залежыць галоўным чынам ад асабістай ініцыятыўнасці настаўніка або вучняў, гэта значыць, ад фактараў у пераважнасці прыватных. Большасць вучняў яна не ахоплівае.

Рэтраспектыўны разгляд праблемы развіцця літаратурна-творчьіх здольнасцей школьнікаў. а таксама аналіз яе сучасна.а стану ў працах метадыстаў, педагогаў і псіхолагаў дазваляе зрабіць некаторьія **вывады:** выхазакне літаратурнай творчасці ў дзяцей аказваецца не тольк: магчымым. але і абсалютна непазбежнкм. Паводле М.М.Бахціна. чытачу неабходны хаця б невялікі вопыт "бывання" ў аўтарскай пазіцьц. Значэнне гэтай творчасці, па словах

Л. С. Выгоцкага, "важна хутчэй для самога дзіцяці, чым для літаратуры. Было б няправільна і несправядліва разглядаць дзіця як пісьменніка і прад'яўляць да яго твораў такія ж патрабаванні, якія мы прад'яўляем да твораў пісьменніка. Дзіцячая творчасць... неабходна перш за ўсё для разгортвання творчых сіл самога аўтара".

Творчая работа вучняў каштоўная не тым, што яна можа прыносіць нейкі мастацкі плён у выглядзе завершаных твораў. а пазнавальна-выхаваўчым вынікам, таксама магчымасцю кожнаму самавыявіцца, самасцвердзіцца праз творчасць. Галоўная мэта творчых заданняў перш за ўсё развіццёвая — фарміраваць у вучняў мастацкі густ, адчувальнасць да мастацкага слова, назіральнасць, паэтычнае бачанне. Разам з тым далучэнне вучняў да літаратурнай справы садзейнічае не толькі ўзбагачэнню іх эмацыянальна-эстэтычнага, але і маральна-этычнага вопыту. Глыбокі сэнс творчых работ, дакладней, творчай работы вучняў на ўроках (бо апошнюю нельга разумець толькі як напісанне вучнямі самастойных твораў, яе вынікамі можа быць І самастойна знойдзеная дэтапь у вусным адказе пра творчасць пісьменніка ці пра асобны твор, уласна зробленае назіранне, абагульненне і г.д.) у канчатковым выніку і заключаецца ў заахвочванні да са.мастойнай разгадкі такіх "тайн" у літаратуры, мае на мэце схіліць вучня да пастаяннага і асэнсаванага чытання мастацкіх твораў, якое развівае чалавека, садзейнічае глыбокаму ўспрыманню і разумению літаратуры, актыўнаму фарміраванню духоўнай і эстэтычнай культуры.

"Пафас мастацтва, - сцвярджаюць філосафы, - у закліку чалавека да творчасці, бязмежнага пераўтварэння навакольнага свету і самога сябе. Мастацтва заклікае да творчасці тым, што само ўяўляе сабой найбольш ярка выражаную мадэль творчасці" [24]. Калі літаратура - мастацтва слова, то ўрок літаратуры па сваёй сутнасці — гэта мастацтва спасцігаць мастацтва, і методыка яго павінна служыць гэтаму прызначэнню.

## Літаратура

1. Методика преподавания литературы: Учеб. для пед. вузов: В 2 ч. /Под ред.: О. Ю. Богдановой, В. Г. Маранцмана. - М.: Просвещение; ВЛАДОС. 1994. - Ч.1.: Методика преподавания литературы: Учеб. для студентов пед. вузов 0.10. Богданова. С. А. Леонов, В. Ф. Чертов: Под ред. О. Ю. Богдановой. - М.: Издат. центр "Академия", 1999: Методические рекомендации по литературно-творческому развитию школьников зо внеклассной работе Науч.-лсслед. ин-т худож. Воспитания. Акад. пед. наук СССР: Сост. В. П. Лейбсон. - М.. 198-1; Методыка выкладання беларускай літарагуры: Вучоб. дапам. Л. В. Асташонак. 1". С. Гарадко. Г .М. Ішчанка і інш.: Пад рэд. В. Я. Ляш> ≤. - Мінск: "Экагіерспектыва". 1999.

2. Методика преподавания литературы: Учеб. для пед. вузов: В 2 ч. /Под ред.: О. Ю. Богдановой, В. Г. Маранцмана. 4.1. - М.: Просвещение; ВЛАДОС, 1994.

3. Квятковский Е. В., Гуревич А. М., Сараскина Л. М. О системе критериев литературно-художественной подготовленности школьников // Сов. педагогика. - 1978. - № 10. - С. 23-31.

4. Туркевіч В. М. Творчасці зярняты залатыя...: Метад. эцюды настаўніка. - Мінск: Нар. асвета, 1988.

5. Корсунский Е.А. Развитие литературных способностей школьников: Учеб. пособие к спецкурсу. - Л.: Ленингр. гос. пед. ин-т, 1985.

6. Цейтлин А. Г. Труд писателя: Вопр. психологии творчества, культуры и техники писательского труда. - М.: Сов. писатель, 1962.

7. Леонтьев А. А. Психолингвистические единицы и порождение речевого высказывания. - М.: Наука, 1969.

8. Бершадская Н. Ф., Халимова В. 3. Литературное творчество учащихся в школе: Кн. для учителя. - М.: Просвещение, 1986.

9. Иванихин В. В. Почему у Ильина читают все? : Кн. для учителя. - М.: Просвещение, 1990.

10. Сочинения и литературное творчество учащихся: Указ. лит. (1759-1986 гг.) /Сост. И. П. Павлов. - М.: Моск. гос. пед. ин-т, 1988.

11. Толстой Л. Н. Кому у кого учиться писать: крестьянским ребятам у нас или нам у крестьянских ребят? // Русские методисты-словесники в воспоминаниях: Сб. / Сост. В. С. Баевский. - М.: Просвещение, 1969. - С. 154 - 174.

12. Замоцін 1.1. Мастацкая літаратура ў школьным выкладанні: Метадыч. нарысы. Вып. 1. - Мінск, 1927.

13. Соколов Н. М. Устное и письменное слово учащихся. - М.-Л.: Гос. изд-во. 1927.

14. Роткович Я. А. История преподавания литературы в советской школе: Учеб. пособие. - 2-е изд. - М.: Просвещение, 1976.

15. Сухомлинский В. А. Сердце отдаю детям. - Минск: Нар. асвета, 1982. Вітка В. Урокі: Артыкулы, выст\пленні, нататкі. - Мінск: Мает, літаратура, 1982.

16. Глоцер В. П. Дети пишут стихи: Кн. о детском лит. творчестве. - М.: Просвещение, 1964.

17. Рыбникова М. А. Очерки по методике литературного чтения: Пособие для учителя. 4-е изд.. испр. - М.: Просвещение, 1985.

18. ТопоровА. М. Я-учитель: Воспоминания. - М.: Дет. лит., 1980.

19. Русские писатели о литературном труде (ХУШ-ХХ вв.): Сб.: В 4 т. Т.З. Под общ. ред. Б.Мейлаха. - Л.: Сов. писатель. Ленингр. отд-ние, 1955.

20. Корсунский Е.А. Психология литературного творчества школьников: Учеб. пособие к спецкурсу / Ленингр. пед. ин-т. - Л., 1983.

21. Выготский Л. С. Воображение и творчество в детском возрасте. - СПб.: Союз. 1997.

22. Лазарук М. А. Навучанне і выхаванне творчасцю: Пед. роздумьі і пошукі. - Мінск: Нар. аезета. 1994.

23. Лобанова Б. Е. Философия и социология творчества. - Саратов: Изд-во Сарат, ун-та. 1983.

## Пытанні і заданнідля самастойнай работы

1. У чым вы бачыце асноўныя асаблівасці арганізацыі літаратурнай творчасці школьнікаў?

2. Якія віды літаратурнай творчасці вучняў прадстаўлены ў школьных праграмах па літаратуры?

3. Якое месца ў праграме па літаратуры займаюць пытанні развіцця літаратурна-творчых здольнасцей школьнікаў? Як гэта пытанне адлюстравана ў раздзеле "Асноўныя патрабаванні да ведаў, уменняў і літаратурнага развіцця вучняў"?

4. Прааналізуйце змешчаныя ў падручніках-хрэстаматыях матэрыялы, што неабходны настаўніку для арганізацыі літаратурна-творчай дзейнасці школьнікаў.

5. Прааналізуйце падручнікі па літаратуры для старэйшых класаў. Наколькі іх змест адпавядае метадалогіі творчага навучання школьнікаў?

6. Пералічыце асноўныя метадычныя прыёмы, якія накіраваны на развіццё літаратурна-творчай дзейнасці вучняў.

7. Пералічыце крытэрыі літаратурна-творчага развіцця вучня.

8. Як здзяйсняецца ўзаемасувязь паміж урокамі рускай і роднай літаратур у працэсе фарміравання літаратурна-творчых здольнасцей навучэнцаў?

9. На канкрэтным прыкладзе пакажыце, як можна падрыхтаваць вучня да ўласнай літаратурнай творчасці (клас, жанр па выбару).

10. Якія з відаў работ па літаратурнай творчасці вучняў вы лічыце неабходнымі, а якія - вельмі складанымі, непажаданымі? Абгрунтуйце свой адказ.

11. Якім чынам можна сёння заахвоціць школьнікаў літаратурнай творчасцю? Пералічыце магчымыя формы работы з вучнямі ў пазакласны час.



• • і